Регистрационный номер Национального реестра 8/13684

ЗАГАД МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

11 сакавіка 1994 г. № 76

Для паляпшэння якасці падрыхтоўкі сярэдніх медыцынскіх работнікаў, з мэтай далейшага пераходу да падрыхтоўкі фельчараў і акушэрак ЗАГАДВАЮ:

1. Зацвердзіць Часовае палажэнне аб пераводзе на навучанне па спецыяльнасцях 0401 «Лячэбная справа» і 0402 «Акушэрская справа» (дадатак).

2. Прыступіць да падрыхтоўкі фельчараў і акушэрак на IV курсе па новых навучальных планах з 1 верасня 1994 г.

3. Кантроль за выкананнем гэтага загада ўскласці на начальніка галоўнага ўпраўлення кадраў, навукі і знешніх сувязей Шыла У.У.

**Міністр** **В.С.Казакоў**

Дадатак
да загаду
Міністэрства аховы здароўя
Рэспублікі Беларусь
11.03.1994 № 76

**ЧАСОВАЕ ПАЛАЖЭННЕ**
**аб пераводзе на навучанне па спецыяльнасцях «Лячэбная справа» і «Акушэрская справа»**

1. Агульныя палажэнні.

1.1. План падрыхтоўкі спецыялістаў для атрымання кваліфікацыі фельчара, акушэркі даводзіцца да медвучылішчаў галоўным упраўленнем кадраў, навукі і знешніх сувязей на падставе папярэдняга аналізу заявак органаў аховы здароўя.

1.2. Медыцынскім вучылішчам даецца права самастойна прымаць да 10 % навучэнцаў ад даведзенага плана для падрыхтоўкі па спецыяльнасцях «Лячэбная справа», «Акушэрская справа» з ліку выпускнікоў мінулых гадоў, якія набылі спецыяльнасць 0408 «Сястрынская справа».

2. Перавод з III курса на IV для атрымання кваліфікацыі фельчара, акушэркі праводзіцца па заявам навучэнцаў на конкурснай аснове пасля завяршэння праграмы навучання па спецыяльнасці «Сястрынская справа» і здачы дзяржаўных экзаменаў.

2.2. Пры наяўнасці конкурса сярод навучэнцаў для атрымання кваліфікацыі фельчара ці акушэркі перавод ажыццяўляецца па выніках семестравых экзаменаў і дыферэнцыраваных залікаў за ўвесь перыяд навучання.

2.3. Перавага пры адборы навучэнцаў для атрымання кваліфікацыі фельчара ці акушэркі аддаецца тым з іх, хто атрымаў найбольшы сярэдні бал. Пры роўнасці сярэдніх балаў перавага аддаецца тым навучэнцам, якія маюць больш высокія адзнакі па прафіліруючых прадметах, жыхарам сельскай мясцовасці ці жадаючым працаваць у сельскай мясцовасці юнакам.

Улічваюцца пры адборы таксама арганізацыйныя здольнасці, удзел у грамадскім жыцці вучылішча, здольнасць да клінічнага мышлення.

2.4. Навучэнцам III курса па спецыяльнасці «Сястрынская справа», якія не прайшлі па конкурсу для атрымання кваліфікацыі фельчара ці акушэркі, выдаецца дыплом устаноўленага ўзору з прысваеннем кваліфікацыі медыцынскай сястры.

2.5. Рашэнне аб пераводзе прымаецца педагагічным саветам, афармляецца пратаколам паседжання педагагічнага савета і загадам дырэктара.

2.6. Навучэнцы, якія прайшлі конкурсны адбор для атрымання кваліфікацыі фельчара ці акушэркі, працягваюць навучанне на IV курсе.

Пасля паспяховага завяршэння праграмы навучання па спецыяльнасці «Лячэбная справа», «Акушэрская справа» і здачы дзяржаўных экзаменаў выпускнікам выдаецца толькі адзін дыплом устаноўленага ўзору з прысваеннем кваліфікацыі фельчара ці акушэркі.